# БІБЛІЯТЭКАЗНАЎСТВА, КНІГАЗНАЎСТВА, БІБЛІЯГРАФАЗНАЎСТВА

*В. І. САІТАВА*

## ПЕРСАНАЛЬНАЯ КРАЯЗНАЎЧАЯ БІБЛІЯГРАФІЧНАЯ ПРАДУКЦЫЯ: КІРУНКІ ЎДАСКАНАЛЕННЯ

*Упершыню аналізуецца відавы і змястоўны склад персанальнай краязнаўчай бібліяграфічнай прадукцыі бібліятэк Беларусі апошніх гадоў, выяўлены метадычныя інавацыі і перспектыўныя кірункі.*

Персанальны аспект ведаў з'яўляецца адным з галоўных у краязнаўстве, што адрознівае гэту галіну ад многіх іншых галін навукі і практыкі. Адпаведна ў інфармацыйным забеспячэнні краязнаўства персанаграфіі надаецца асаблівая ўвага, што на працягу многіх гадоў праяўляецца ў актыўнай падрыхтоўцы персанальнай бібліяграфічнай прадукцыі. Але ўзнікла праблемная сітуацыя, сутнасць якой заключаецца ў тым, што, з аднаго боку, у беларускім бібліяграфазнаўстве гэта прадукцыя яшчэ не вывучалася, таму аналіз кірункаў яе вытворчасці і метадычная ацэнка ўяўляюцца актуальнымі. І, з другога боку, існуюць падставы абвергнуць тое прыніжэнне ролі персанальных бібліяграфічных паказальнікаў, якое час ад часу выказваецца асобнымі спецыялістамі [2]. Нельга пагадзіцца з А. М. Маславай, якая, ацэньваючы сучасную краязнаўчую бібліяграфічную прадукцыю бібліятэк Расіі, напісала, што “ценность” персанальных краязнаўчых дапаможнікаў не можа скласці канкурэнцыю “серьезности” паказальнікаў іншага зместу [2, с. 119]. На нашу думку, даследчыца не ўлічвае асаблівасці змястоўнай структуры краязнаўчых ведаў і беспадстаўна пераносіць на краязнаўчыя бібліяграфічныя дапаможнікі крытычныя ацэнкі, якія датычыліся нізкага ўзроўню выкарыстання персанальных бібліяграфічных паказальнікаў па шэрагу іншых галін ведаў.

Бясспрэчнымі доказамі запатрабаванасці персанальнай краязнаўчай бібліяграфічнай прадукцыі з'яўляюцца бесперапыннае павелічэнне яе падрыхтоўкі, пашырэнне відавога і жанрава-тыпалагічнага складу.

Персанальная краязнаўчая бібліяграфічная прадукцыя прадстаўлена сёння друкаванымі самастойнымі дапаможнікамі і несамастойнымі бібліяграфічнымі матэрыяламі; паказальнікамі персаналій (імяннымі) у бібліяграфічных, навуковых, навукова-папулярных і вучэбных выданнях краязнаўчага характару; бібліяграфічнымі спасылкамі ў навуковых і папулярных публікацыях, прысвечаных асобам краю; раздзеламі персаналій у краязнаўчых карткавых каталогах; персанальнымі БД, персанальнымі слоўнікамі, што з'яўляюцца элементам суправаджэння краязнаўчых бібліяграфічных БД.

У стварэнні гэтай прадукцыі прымаюць удзел суб’екты розных інстытуцыяльных каналаў сацыяльных камунікацый. Інстытуцыяльная залежнасць уплывае на працэс падрыхтоўкі краязнаўчай персанальнай бібліяграфічнай прадукцыі, у прыватнасці на замацаванне пэўных формаў бібліяграфічных дапаможнікаў, спецыфіку адлюстравання ў іх змястоўнай сувязі “асоба – рэгіён”.

Асаблівую ролю ў падрыхтоўцы краязнаўчай бібліяграфічнай прадукцыі выконваюць бібліятэкі. Абласныя бібліятэкі (АБ) і ЦБС фарміруюць персанальныя часткі краязнаўчых каталогаў і картатэк, ствараюць бібліяграфічныя дапаможнікі і БД. Гэта работа вядзецца на аснове планавання, рэалізацыі пэўных праграм (тыпу “Спадчына” шэрага абласцей і раёнаў краіны), мадэляў (сістэмы краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў), нарматыўна рэгламентуючых дакументаў, укаранення аналагаў інавацыйнай персанальнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

бібліяграфічнай прадукцыі. Важна, што краязнаўчая бібліяграфічная прадукцыя бібліятэк канцэнтруецца ў адпаведных рэгіёнах, тады як бібліяграфічныя матэрыялы, створаныя іншымі арганізацыйнымі суб’ектамі, патрабуюць павелічэння затрат для мэтанакіраванага пошуку і забеспячэння доступу да іх. Разам з тым электронныя камунікацыйныя каналы, асабліва інтэрнет, ствараючы ўсеагульную даступнасць да краязнаўчай інфармацыі і ведаў, зрабілі магчымым з любой кропкі свету весці пошук звестак аб сваіх продках, знакамітых людзях пэўнага рэгіёна. Вопыт публічных бібліятэк па забеспячэнні краязнаўчых запытаў у рэжыме “віртуальнай даведкі” паказвае з’яўленне карыстальнікаў з далёкага замежжа. Толькі абласныя бібліятэкі і ЦБС могуць прадставіць у электронным асяроддзі з найбольшай паўнатой персанальныя бібліяграфічныя рэсурсы па краязнаўстве. Яны ж забяспечваюць і доступ да вельмі запатрабаванай персанальнай фактаграфіі, значную частку якой рыхтуюць самастойна. Перад беларускімі цэнтрамі бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства паўстала задача алічбоўкі і прадстаўлення поўных тэкстаў рэдкіх і каштоўных краязнаўчых дакументаў, у тым ліку біяграфічных твораў. У сваю чаргу бібліятэкам мэтазгодна выкарыстоўваць web-навігатар для забеспячэння аператыўнага пошуку інфармацыі ў знешніх інфармацыйных рэсурсах праз сістэму спасылак на парталы і сайты з адпаведнымі біяграфічнымі матэрыяламі. Такім чынам абласныя бібліятэкі і ЦБС бесперапынна назапашваюць і ствараюць розныя па відах і формах інфармацыйныя рэсурсы, прысвечаныя персаналіям рэгіёна, канцэнтруюць іх і забяспечваюць аптымальны доступ.

Відавы склад і змест персанальнай краязнаўчай бібліяграфічнай прадукцыі паказвае яе асаблівасці, станоўчыя характарыстыкі і дазваляе вызначыць напрамкі далейшага развіцця.

На сучасным этапе бібліятэкі ствараюць агульныя і спецыяльныя персанальныя краязнаўчыя бібліяграфічныя дапаможнікі. Склад персаналій рэгіёнаў і населеных пунктаў з найбольшай паўнатой прадстаўлены ў агульных дапаможніках: карткавых краязнаўчых каталогах і картатэках, бібліяграфічных і фактаграфічных БД бібліятэк. Па зместавай прымеце яны з'яўляюцца універсальнымі, адлюстроўваюць рэгіянальны склад персаналій за ўвесь гістарычны перыяд. Спецыяльная краязнаўчая бібліяграфічная прадукцыя бібліятэк прадстаўлена навукова-дапаможнымі і рэкамендацыйнымі друкаванымі і электроннымі персанальнымі дапаможнікамі. Па складу персаналій яны абмяжоўваюцца гістарычным перыядам, падзеяй, галіной творчай, прафесійнай ці навуковай дзейнасці, родам заняткаў.

Склад імён, адлюстраваных у персанальных краязнаўчых бібліяграфічных дапаможніках, фарміруецца пад уплывам інфармацыйных патрэб, таму дэтэрмінаваны грамадскімі і гістарычнымі ўмовамі. На сучасным этапе пераасэнсоўваецца рэгіянальная гісторыя, дзеячаў мінулага перасталі жорстка ацэньваць па ідэалагічных крытэрыях. Гэта пазбавіла сучасныя дапаможнікі ад ідэалагем савецкага часу. Не выпадкова расійскія бібліёграфы адзначаюць імкненне да падрыхтоўкі універсальных біябібліяграфічных краязнаўчых дапаможнікаў, тады як у 80-я гг. мінулага стагоддзя адзначалася іх рэдкае з'яўленне [1, с. 93]. Узнікла патрэба бібліяграфічна падаць інфармацыю аб родах мясцовага паходжання, аб знакамітых ураджэнцах і дзеячах незалежна ад іх палітычных, рэлігійных, маёмасных ці іншых статусаў, але выключна па асабістай ролі, знакавасці персоны для рэгіёна.

Персанальныя раздзелы карткавых краязнаўчых каталогаў абласных бібліятэк і краязнаўчых картатэк у ЦБС пакуль што застаюцца буйнейшым універсальным рэсурсам персаналій у рэгіёнах. Электронныя базы даных “Краязнаўства” абласных бібліятэк Беларусі ахопліваюць зараз дзесяткі тысяч бібліяграфічных запісаў, у структуры іх фармату запаўняюцца звесткі аб персаналіі (поле 42А “Фамилия, имя, отчество, персо-налия” паводле праграмы АЛІС). У даведніку (слоўніку) персаналій, які з'яўляецца элементам суправаджэння БД “Краязнаўства”, звесткі аб кожнай асобе адлюстроўваюцца па магчымасці з максімальнай паўнатой; у тым ліку псеўданімы і варыянты напісання прозвішчаў. Існуе вялікі пласт персаналій, звесткі аб якіх могуць быць сабраны і адлюстраваны менавіта на рэгіянальным узроўні. Неабходна падкрэсліць значэнне гэтых слоўнікаў як разнавіднасці аўтарытэтных файлаў персаналій і іх ролю ў пошуку ў краязнаўчых каталогах. У фарміраванні рэгіянальных файлаў персаналій павінна

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выкарыстоўвацца ў якасці крыніц уся персанальная інфармацыйна-бібліяграфічная прадукцыя, ствараемая бібліятэкамі.

Істотнай праблемай на шляху стварэння і выкарыстання электроннай бібліяграфічнай інфармацыі з'яўляецца рознае праграмнае забеспячэнне ў публічных (масавых) бібліятэках краіны. Але для забеспячэння даступнасці бібліяграфічных запісаў, створаных на рэгіянальным узроўні, у працэсе нацыянальнага і міжнароднага абмену мэтазгодна выкарыстанне нацыянальнага камунікатыўнага фармату BelMARC.

На працягу апошняга дзесяцігоддзя абласныя бібліятэкі ва ўзаемадзеянні з ЦБС пачалі фарміраванне электронных БД тыпу "Памяць краю", часткай якіх стаў біябібліяграфічны блок аб знакамітых людзях вобласці, дзе размяшчаюць фактаграфічную, бібліяграфічную, графічную інфармацыю. Уводзяцца даныя аб гістарычных асобах, асобах, узнагароджаных урадавымі ўзнагародамі РБ і СССР, атрымаўшых званне "Заслужаны..." па галіне, аб дзяржаўных і палітычных дзеячах, навукоўцах, военачальніках, пісьменніках, дзеячах мастацтва, спартсменах і іх трэнерах, педагогах, медыках, дзеячах культуры. Такія БД маюць перспектыву пераўтварыцца ў буйнейшы комплексны інфармацыйны рэсурс рэгіянальных персаналій. У далейшым іх развіцці бібліятэкам важна пашыраць кола імён, забяспечыць з дапамогай спасылак сувязь з іншымі раздзеламі гэтых БД і бібліяграфічных БД "Краязнаўства". На практыцы, на жаль, у некаторых бібліятэках па прычынах дэфіцыту рэсурсаў, кадраў і іншага далейшае фарміраванне гэтых БД амаль прыпыняецца.

Да большасці персанальных БД абласных бібліятэк і ЦБС сёння забяспечаны толькі лакальны доступ. Часам гэта тлумачыцца прычынамі абмежаваных рэсурсна-тэхналагічных магчымасцей, часам уключанасцю ў пералік платных паслуг. Нават у выстаўленай у інтэрнеце БД Магілёўскай АБ "Мой край Магілёўшчына" (Mlib.basnet.by/kray/) персанальныя раздзелы не даступныя. Лакальна ж вельмі актыўна выкарыстоўваюцца для забеспячэння адукацыйных і іншых патрэбнасцей карыстальнікаў.

Бібліяграфічныя і фактаграфічныя БД па краязнаўстве неабходна развіваць як у кірунку больш поўнага выяўлення імён адметных дзеячаў мінулага і сучаснасці, так і пашырэння адлюстравання крыніц інфармацыі аб іх. Азнаямленне з асобнымі БД дае магчымасць рэкамендаваць абласным бібліятэкам у мэтах выяўлення новых імён і дакументаваных звестак аб іх вызначыць праграму абследавання крыніц XVIII – XX стст., багатых на біяграфічную інфармацыю. Патрабуюць уважлівага вывучэння польскамоўныя крыніцы: гербоўнікі шляхты, біяграфічныя слоўнікі, выданні афіцыйных дакументаў, краязнаўчыя апісанні беларускіх гарадоў, паветаў і ваяводстваў, перыёдыка XIX – першай паловы XX ст. і інш. Перспектыўным з'яўляецца пашырэнне графічнай і тэкставай інфармацыі, аўдыё- і відэаданых. Папаўненне БД па акрэсленых кірунках замацуе за бібліятэкамі палажэнне галоўных цэнтраў інфармацыйна-бібліяграфічнага забеспячэння па краязнаўстве ў рэгіёнах, у тым ліку адносна карыстальнікаў, якія праводзяць гісторыка-біяграфічныя даследаванні.

Менавіта з пункту гледжання пошуку персанальнай інфармацыі актуальнай з'яўляецца і задача ўзаемавыгаднага доступу да інфармацыйных рэсурсаў паміж бібліятэкамі, архівамі і музеямі. Напрыклад, спісы дваран Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губерняў выстаўлены на сайце Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі, але для бібліятэк вельмі карысным можа быць і доступ да БД "Радавод", якую генерыруе архіў.

З пункту гледжання паўнаты ахопу імён, тэмпаў папаўнення і іншых характарыстык у электроннай прадукцыі няма канкурэнтаў, але іх вартасці не пазбаўляюць шанцаў на паспяховае функцыянаванне друкаваныя бібліяграфічныя дапаможнікі.

Абласныя бібліятэкі і ЦБС пашырылі выпуск краязнаўчых календароў знамянальных і памятных дат, у якіх адлюстроўваюцца звесткі аб ураджэнцах і дзеячах-юбілярах. Некаторыя з іх маюць фактаграфічны характар (без спісаў літаратуры), як календары Гродзенскай абласной бібліятэкі. Вельмі пажадана, каб фактаграфічная і бібліяграфічная інфармацыя выкарыстоўвалася для характарыстыкі асоб і прыцягнення ўвагі спажыўцоў да крыніц дакументнага адлюстравання звестак аб іх. Так, напрыклад, складаюцца календары знамянальных і памятных дат Магілёўскай абласной бібліятэкай. Пажадана выставіць календары на сайты бібліятэк у інтэрнеце, што пакуль зрабілі Брэсцкая і Віцебская АБ. Гэтыя дапаможнікі з'яўляюцца выдатнай крыніцай папулярызацыі краязнаўчых ведаў, іх не выкарыстоўваюць для платных паслуг.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Узрасла ўвага да падрыхтоўкі грунтоўных рэтраспектыўных дапаможнікаў, што сведчыць аб важкасці персанальнага аспекту краязнаўчых ведаў. Сярод іх дапаможнікі, якія адлюстроўваюць склад персаналій за ўвесь гістарычны перыяд, і дапаможнікі, у якіх склад персаналій абмежаваны па вызначаных прыметах. Апошнія з'яўляюцца неад’емным элементам бібліяграфічных рэсурсаў галін краязнаўства (галіновую афарбоўку маюць назвы такіх дапаможнікаў). Грунтоўныя персанальныя дапаможнікі дапамагаюць пераадолець рассеянасць персаналій, існуючую як у дакументным патоку, так і ў сістэматычных карткавых краязнаўчых картатэках.

Да лепшых належаць біябібліяграфічны слоўнік Светлагорскай ЦГБ “Земляки: история Светлогорска в лицах”, паказальнікі Віцебскай АБ “Гісторыя славутых родаў Віцебшчыны”, “Освобождение Витебщины: путь мужества и славы”. Магілёўская АБ мэтанакіравана адлюстроўвае рэгіянальныя персаналіі, выпускаючы персанальныя і біябібліяграфічныя дапаможнікі, у якіх асобы аб’ядноўваюцца па прыметах роду заняткаў і прафесіі. Гэта паказальнікі і даведнікі “Даследчыкі роднага краю” (1996), “Выпускнікі і навучэнцы Магілёўскай мужчынскай гімназіі” (1999), “Мовазнаўцы Магілёўшчыны” (1999), “Філіповіч Іеранім Іосіфавіч” (1999), “Дзеячы архітэктуры і выяўленчага мастацтва Магілёўшчыны” (2005) і інш.

Віцебская АБ першай у Беларусі пачала падрыхтоўку электронных персанальных краязнаўчых бібліяграфічных паказальнікаў і біябібліяграфічных даведнікаў. Зараз праз сайт бібліятэкі даступныя шэсць такіх бібліяграфічных дапаможнікаў. Сістэма спасылак забяспечвае пошук па раздзелах, па рубрыках дапаможных імянных і геаграфічных паказальнікаў. Фармат pdf ахоўвае іх ад несанкцыянаванага ўмяшання.

Аналіз сучасных бібліяграфічных прац сведчыць аб іх высокай якасці, аб умелым выкарыстанні складальнікамі метадычных навацый, аб майстэрстве бібліяграфічнага і фактаграфічнага пошуку. Напрыклад, біябібліяграфічны слоўнік Светлагорскай ЦГБ “Земляки: история Светлогорска в лицах”, створаны на аснове БД “Знаменитые люди города”, з метадычнага пункту з'яўляецца інавацыйным прадуктам. У прыватнасці, для выяўлення асоб і біяграфічных даных праведзена вялікая пошукавая работа, сабраны даныя з друкаваных крыніц, выкарыстана інфармацыя, прадстаўленая аддзеламі кадраў прадпрыемстваў і ўстаноў горада, музеем гісторыі Светлагорска, матэрыяламі перапіскі і вуснымі звесткамі, атрыманымі падчас асабістых сустрэч з выдатнымі людзьмі складальніцы слоўніка Г. І. Захаранка. Дапаможнік станоўча вызначаецца інфармацыйнай насычанасцю, акцэнтаваннем увагі на ролі чалавека ў жыцці горада, што ўдаецца не ўсім стваральнікам падобнай прадукцыі. Шэраг даведак упершыню ўяўляюць сабой звесткі аб асобах у выглядзе дакументаванага тэксту. Усе групы бібліяграфуемых матэрыялаў і крыніц інфармацыі дакладна структураваны, маркіруюцца ўмоўнымі знакамі. Біябібліяграфічны даведнік якасна аформлены: афсетны друк, шмат вершаваных эпіграфаў, партрэтныя, групавыя і відавыя фотаздымкі гараджан і г. Светлагорска.

Біябібліяграфічны паказальнік “Освобождение Витебщины: путь мужества и славы” Віцебская абласная бібліятэка прысвяціла асобам, якім за вызваленне Віцебшчыны было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Уключаны дакументы за вялікі храналагічны перыяд, з 1944 г. па май 2004 г., якія маюцца ў фондах абласной бібліятэкі. У аснове групоўкі матэрыялу ўдала выкарыстаны прынцып адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу вобласці. Методыка гэтага паказальніка адпавядае яго ідэйнай задуме і таксама можа быць прыкладам пры падрыхтоўцы вялікіх біябібліяграфічных дапаможнікаў, у якіх неабходна акцэнтаваць пэўны аспект сувязі “асоба – край”.

Дзейнасць па падрыхтоўцы дапаможнікаў, прысвечаных мясцовым радаводам, асабліва складаная, даследчая, не была характэрнай для айчынных бібліятэк амаль да нашага часу (у адрозненне ад публічных бібліятэк у заходніх краінах). Глыбінныя асновы сувязі “чалавек – край”, у прыватнасці такой якасці асобы, як патрыятызм, палягаюць у пазнанні каранёў свайго роду. Работа па сямейнай гісторыі ў ЦБС краіны ўжо пачынаецца. Напрыклад, у Жодзінскай ЦГБ з дапамогай архіва сабраны матэрыялы па частотных прозвішчах Курсевічаў і Шэметаў, праведзены святы гэтых родаў. Дакументны матэрыял атрымаў бібліяграфічнае адлюстраванне ў краязнаўчым даведачна-бібліяграфічным апараце бібліятэкі. Гэты кірунак належыць да найбольш перспектыўных. Бібліяграфічнае адлюстраванне радаводаў разнастайнае, але найбольш эфектыўным кампанентам

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

інфармацыйных рэсурсаў па сямейнай гісторыі можа быць паўнатэкставая БД тыпу "радавод". Выяўленыя унікальныя і каштоўныя дакументы часцей за ўсё могуць быць прадстаўлены ў бібліятэках толькі ў алічбаванай форме. Папулярнасцю будуць карыстацца і друкаваныя дапаможнікі. Пакуль што выдадзены толькі адзін дапаможнік "Гісторыя славутых родаў Віцебшчыны" Віцебскай АБ.

Бібліяграфічныя дапаможнікі, прысвечаныя вучоным, выкладчыкам ВНУ, мясцовым арганізацыям і ўстановам звычайна разглядаюцца ў складзе галіновых бібліяграфічных рэсурсаў. Уключэнне ў такія дапаможнікі структурных падраздзяленняў з бібліяграфічнымі запісамі аб саміх дзеячах і ўстановах, што назіралася ў разглядаемы перыяд, павялічыла іх ролю як крыніц краязнаўства. Адлюстраванне сувязей "персона – установа" і "персона – населены пункт/рэгіён" спрыяе вывучэнню жыцця і дзейнасці выдатных спецыялістаў і вучоных, якія незалежна ад галіновай накіраванасці займаюць пачэснае месца ў краязнаўстве. Вельмі пажадана, каб на адзначаныя аспекты звярнулі ўвагу бібліёграфы як пры падрыхтоўцы, так і пры выкарыстанні бібліяграфічнай прадукцыі (натуральна, што яны добра адлюстраваны ў дапаможніках, прысвечаных даследчыкам краю). Мэтазгодна ў тэкставых (біяграфічныя даведкі, артыкулы, успаміны), бібліяграфічных (спісы літаратуры аб жыцці і дзейнасці) і ілюстрацыйных матэрыялах (фотаздымкі) паказваць дасягненні чалавека ў непарыўнай сувязі з яго ўкладам у развіццё дадзенай установы, горада, рэгіёна. Такія метадычныя прыёмы ўдала выкарыстаны ў паказальніку "Прафесар Мікалай Васільевіч Абабурка" Магілёўскай абласной бібліятэкі і інш. Персанальныя дапаможнікі, як правіла, насычаны фактаграфічнымі і бібліяграфічнымі матэрыяламі, што абумоўлівае складанасць іх структуры, многія добра аформлены. Пажадана канкрэтызаваць асобныя даты ў распаўсюджаным у гэтых дапаможніках раздзеле, прысвечаным асноўным датам жыцця і дзейнасці. У ім указваюць, як правіла, гады без дзён і месяцаў, але існуюць даты, якія пажадана паказваць больш дакладна. Гэта даты прысваення званняў, прызначэння на пасады ва ўстановах рэгіёна (населенага пункта), важнейшыя падзеі сямейнага жыцця. Дакладнасць храналагічнага матэрыялу можа прынесці карысць не толькі ў вывучэнні біяграфіі асобы, але і ў даследаваннях развіцця рэгіёна.

Такім чынам, персанальныя дапаможнікі развіваюцца як адзін з найбольш устойлівых элементаў краязнаўчай бібліяграфічнай прадукцыі. Разнастайнасць формаў, тыпаў і жанраў, шырыня зместу і інавацыйная методыка, характэрныя для значнай часткі персанальных бібліяграфічных матэрыялаў, з'яўляюцца вынікам дзейнасці бібліятэк і іншых арганізацый па ўдасканаленні інфармацыйнага забеспячэння краязнаўства. Уся сукупнасць персанальнай бібліяграфічнай прадукцыі фарміруе аснову інфармацыйнага забеспячэння папулярызацыі краязнаўчых ведаў, патрыятычнага выхавання, рэгіянальнага кампанента ў адукацыі, рэгіянальнай біяграфістыкі і іншых краязнаўчых даследаванняў.

---

1. *Коган, Е. И.* Пути повышения воспитательной роли краеведческих биобиблиографических пособий / Е. И. Коган // Актуальные вопросы краеведческой библиографии и подготовки библиографических пособий в РСФСР: сб. науч. тр. – Л., 1985. – С. 92 – 105.

2. *Маслова, А. М.* Итоги издательской библиографической деятельности библиотек в области краеведения / А. М. Маслова // Проблемы краеведческой деятельности библиотек: материалы Всерос. науч.-практ. семинара (Великий Новгород, сентябрь 2002 г.) – СПб.: Российкая национальная б-ка, 2003. – С. 112 – 123.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ